Іван Курбека



Іван Курбека

# Хітрыя літары



Шарады
Метаграмы
Лагагрыфы
Анаграмы

Мінск
«Юнацтва»
1991

ББК 84 Бел7
К 93

Рэдактар выдавецтва М. П. ПАЗНЯКОЎ

Мастак Ю. А. МАДЛІНСКІ

Книгу составили лингвистические загадки — шарады, метаграммы, логогрифы, анаграммы.

Они пробуждают языковое чутье, развивают смекалку и изобретательность. История и литература, география и природа, спорт и быт людей — вот далеко не полный перечень тем, отраженных в загадках.

К $\frac{4803120201-034}{М\ 307(03)-91}$ 62—91

ISBN 5-7880-0553-1

© І. С. Курбека, 1991
© Ілюстрацыі. Ю. А. Мадлінскі, 1991

# Шарады



Слова
Са словам
Складзі —
Сэнс
Аб'яднаны
Знайдзі.

Мой пачатак —
Навальнічны,
Рэшта —
Водарасцей слой,
А ўсё разам —
Я камічны,
Мудры казачны герой.

*(Бура+ціна)*



Са злучнікам
Часціца
Побач стала —
І атрымаўся
Верш Купалы.

*(«Але+ся»)*

З нотай
Прыназоўнік
Уступілі ў лад —
Утварылі разам
Баявы снарад.

*(Мі+на)*





Да дрэва
Кіпень
Прыкладзі —
У першы клас
Са мной
Ідзі.

*(Бук+вар)*

Часціца
З камяніцай
З'ядноўваюцца
Ў пáру.
Прад намі
Каб з'явіцца,
Героем стаць
Гайдара.

*(Ці+мур)*

Прыназоўнік,
Дужа прыткі,
Даў лічэбніку
Руку —
І стварыў увачавідкі
Беларускую раку.

*(Пры+пяць)*



Я ўжо народжана
Такою,
Што караблям
Служу бядою,
Для іх —
Ну, проста нерат.
Калі ж спакойна
Ўперад
Паставіш
Дрэў
Ахоўны слой,
Ты зможаш
Ласавацца мной.

*(Кара+мель)*

У гарах блукаю
Дзікі
Сваёй першай часткай.
А другою —
Невялікі
Я зямельны ўчастак.
Поўным словам —
Я такі:
Мяне цэняць
Маракі.

*(Як+ар)*




Пачатак —
На дрэве тырчу я,
Канцоўка —
Заўсёды
Конь чуе.
А возьмеш
У цэлым спляценні —
З мяне ты
Пашыеш адзенне.

*(Сук+но)*

Калі зірнуць
На гэта слова,
Ва ўсім тут
Бык або карова:
Паглядзіш спераду —
Рыканне,
А ззаду —
Сродак для бадання.
Акінеш вокам
Усю форму —
Быку й карове
Служыць
Кормам.

*(Му+рог)*

Захоўваць харч —
Мой лёс такі:
Капусту, бульбу,
Агуркі...
А распадуся папалам —
Я не патрэбен
Болей вам:
Не захавальнік,
Не ахоўнік.
З мяне ўтварыўся
Прыназоўнік.
Яшчэ,
Скажу вам
Без маны,—
І насып доўгі,
Земляны.

*(Падвал=пад+вал)*

Двух прадметаў
Спалучэнне —
Частка першая мая.
Ад турбот
Заспакаенне
Дам
Другою часткай я.
Цалкам —
Дождж як пырскане,
Возьмеш з радасцю
Мяне.

*(Пара+сон)*

Мера плошчы —
Зямля —
Як спалучыцца
З нотай,
Твор вядомы
Брыля
Прачытаеш
З ахвотай.

*(«Га+ля»)*



Стэп.
Пустыня.
Там звычайна
Курганом
Я паўстаю.
Пачастую
Кавай, чаем —
Палавіну
Знай маю.
А другую —
Ты нямарна
Паламай,
Мой братка, голаў:
То ж — манарх,
Князь уладарны
Або ў цюркаў,
Ці ў манголаў.

*(Бархан=бар+хан)*

Першы склад мой —
Ведаў мера,
Склад другі —
Мішэнь гульні:
Не выходзячы
З кватэры,
На паветры
Адпачні.

*(Бал+кон)*

Прыправа
І нота
Займелі лады —
Стварылі ахвотна
Драбніцу вады.

*(Кроп+ля)*

У тым, сябры,
Яго віна ўся:
Быў лётчык,
Слаўны, баявы.
З жаночым імем
Як спазнаўся,
Зрабіўся дрэвам
Ліставым.

*(Ас+іна)*

Пачатак мой —
Сталічны.
Ён — горад
Сімпатычны.
Канец —
Парою года
З'яўляецца
Заўсёды.
Калі ў адно
Змацуеш,
Ты оперу
Пачуеш.

*(«Рыга+лета»)*

Зімой і летам
Адным цветам
Расту, красуюся
На поўдні:
Пачаткам —
Упакуй прадметы,
Канцом —
Запас харчоў
Папоўні.

*(Кіпарыс=кіпа+рыс)*



# МЕТАГРАМЫ

Літара
Мяняецца —
Сэнс
Другі
З'яўляецца.



Я грамадзян усіх
Шаную,
Мяне баіцца
Ліхадзей.
Змяніўшы «у» на «а»,
Пачну я
Пладамі
Надзяляць людзей.

*(Суд—сад)*

Я ў зелень
Прыгожа адзеты.
І цэніш
Па праву
Мяне ты.
А літару зменіш —
І з пашы
Зраблюся
Бунтоўнай ракой,
Дзе воіны мірныя нашы
Фашыстам далі
Першы бой.

*(Луг—Буг)*

Посуд я шкляны,
І, пэўна, ты
Ведаеш мяне,
Як белы свет.
А заменіш
Зычны канцавы —
На паперы
Пракладу я след.

*(Графін—графіт)*

Лес вялікі,
Знакаміты,
Заблудзіцца можна ў ім.
Адну літару
Змяні ты,
І —
Паэтаў
Псеўданім.

*(Пушча—Гушча)*

Дзяўчаткі
Выплылі на сцэну,
Іх рухі блізкія,
Свае.
У танцы
Зычнай дай замену —
І Багдановіч паўстае.

*(«Лянок»—«Вянок»)*



З «п» —
Я пад тваёй пятою
Паскараю
Табе шлях.
З «м» —
Зазвычай у героя
Горда ззяю на грудзях.

*(Педаль—медаль)*



Выкапень карысны
(Замест «а» напішаш «е»)
Робіцца капрызным:
Смак дае
Ці не дае.

*(Апатыт—апетыт)*



У касьбу
Я ёй падмога
(Як ты тут ні гавары):
Палягчаю ёй
Дарогу,
Покуль сонца
Не ўгары.
Бо адзін жа ў нас
Намер
(«К» ў яе, а ў мяне «р») —
Разумееце і вы —
Назапасіць больш
Травы.

*(Раса—каса)*



З «л» —
Я мэблю пакрываю,
З «б» —
Я вадкасці змяшчаю,
З «м» —
Расту я на градзе,
З «р» —
Сустрэнеш у вадзе.

*(Лак — бак — мак — рак)*




Зброя разрыўная
Літару мяняе —
Мужна,
Зноў і зноў
Чуецца
Святлоў.
*(Граната—«Гранада»)*

Са звонкім гукам —
Кожны рады
Мяне ссушыць
Або спячы.
Калі ж з глухім —
Шукаюць рады,
Каб ад мяне як
Уцячы.
*(Грыб—грып)*

З літарай «к» —
Даю малака
Дарослым і дзеткам.
«В» калі маю,
Стол аздабляю,
Захоўваю кветкі.
*(Каза—ваза)*



Хочаш есці —
Калі ласка,
Да мяне
Завітвай брава:
Бутэрброд табе,
Каўбаска,
Ёсць кефір,
Напітак, кава.
Паясі —
Не будзь сярдзіты:
«Ф» на «к»
Хутчэй змяні ты —
Паслухмяна,
Неўзаметку
Перайду
У кветкі.
*(Буфет—букет)*

Друк перыядычны,
Калі зменіць
Зычны,
Пацячэ ракою,
Не абы-якою:
Ёй радкоў нямала
Прысвяціў
Купала.
*(Прэса—Арэса)*




Я нагадваю
Палатку.
Змяні літару
Ў пачатку —
І пабачыш:
Тут жа стану
Легендарным партызанам.

*(Шалаш—Талаш)*

Ты не чакай
Саміх удач,
Трымайся
Устаноўкі:
Імя мужчыны
Перайнач —
Чытай
Паэму Броўкі.
*(Глеб—«Хлеб»)*

Пастарайся ты
Слову
У канцы
Даць абнову —
І напітак салодкі
Загучыць
Вершам Цёткі.
*(Морс—«Мора»)*



Пасажыраў
Поўна хата
Ўдалячынь імчыць.
«В» на «п» змяні —
Ў салдата
Ўбачыш на плячы.
*(Вагон—пагон)*

З «е» —
Дружу
З будаўнікамі.
З «а» —
Купляй
У хлебнай краме.
*(Бетон—батон)*

Быў плавання стыль.
Стаў гладзіць тэкстыль.
Чынам якім? —
«Б» стаў глухім.
*(Брас—прас)*


Лагагрыфы
Літару
Адкінь
Альбо
дадай —
І загадку
Разгадай.

Я —
Курорт вядомы.
Адну літару
Дадай —
І спакойна дома
Ты на мне
Адпачывай.

*(Анапа—канапа)*

Час быў.
Змагалася
Мужна я,
Моладзь была ў мяне
Дружная.
Я і сягоння
Узнёслая:
Вы забярыце
Галосную —
Простая,
Ціхая станцыя,
Дам вам
Вялікія танцы я.

*(Обаль—баль)*

Слухай мяне,
Братка:
Літару
Ў палатку
Акуратна ўкінь —
І горнарабочы
З'явіцца на вочы,
Падзямелля сын.

*(Шацёр—шахцёр)*

Мы з ім быццам радня.
Ты без нас ані дня.
Я ваду падаю,
Ён жа
Ў памяць тваю
Веды,
Мудрасць нясе.
І нас любяць усе.
Ты праз нас
Без адрыву ад хаты
І душою,
І целам
Багаты.

*(Кран—экран)*

Без лішняе гутаркі
Адкідвай ты
Гук толькі
Ад узнагароды,
Спартыўнага прыза —
На востраў Свабоды
Атрымлівай
Візу.

*(Кубак—Куба)*

Вялікі кампазітар
Галосную прыдбаў —
І месцам
Гістарычнай бітвы
Ён ганарова стаў.

*(Барадзін—Барадзіно)*

Геаметрычнае цела
Толькі да зычнай
Прымкне —
Добразычліва
І смела,
Дружа,
Цябе крытыкне.
*(Шар—шарж)*



Сачыць
За спартыўнай гульнёю
Публічна
З мяне
Табе ўтульна
І ёмка.
А толькі
Далучыцца зычны —
Я твор назаву
Макаёнка.
*(Трыбуна—«Трыбунал»)*

У мяне —
Нагі чатыры,
На маім
Сядзіш ты карку.
«У» як трачу,
Біўні-пыры,
Хобат мой —
У заапарку.
*(Услон—слон)*



Ад нягод
Матор машыны
Я хаваю.
З «м»-устаўкай —
Мяне вып'еш
Замест чаю.
*(Капот—кампот)*

Жыллё для жывёл
Пад зямлёю
Запоўніцца можа
Вадою
І возерам казачным
Стаць,
Як літару
Толькі дадаць.

*(Нара—Нарач)*

Шавецкая прылада
(Змякчыць канцоўку варта)
Мясцінай
Стацца рада,
Дзе нарадзіўся
Цішка Гартны.

*(Капыл—Капыль)*

Да ўзвышша
Зычную дадай —
Машыну
Ў стойла заганяй.

*(Гара—гараж)*



Мэбля бытавая
Зробіцца
Ўзрыўчаткай,
Калі занядбаеш
Літару
Ў пачатку.

*(Стол—тол)*

Абрамляць карціну —
Лёс мой не адзіны.
А яшчэ
З дадаткам:
«Н» плюс
У канчатку —
Я, павер мне,
Мігам
Станаўлюся кнігай.

*(Рама—раман)*

Від паветранага бою,
Што даступны
Мужным, стойкім,
Толькі
Літарай адною
Розніцца
Ад упакоўкі.

*(Таран—тара)*

**Калі
Маленькую манету
Рацыянальна
Скарыстаць,
Яна захоча,
Верце ў гэта,
Героем Мележавым
Стаць.**

*(Капейка — Апейка)*



Маўклівы
Хаты вартаўнік
(Без пахвалы і лаўраў),
Каб толькі
Зычны першы
Знік,
Стаць мог бы
Творам Маўра.

*(Замок — «Амок»)*

Ад імені
Галосная
Адпала —
Застаўся нам
Ляўкоўскі
Верш Купалы.

*(Лёня—«Лён»)*



Магу
Заправай быць
І стравай.
Прыставіш літару —
Цікава:
Я Коласавым вершам
Стану,
Прысвечаным
Узбекістану.

*(Сала—«Салар»)*

Мінерал
Напаўкаштоўны,
Дадасі калі
Тактоўна
Алфавітную адзінку,
Ператворыцца адразу
Ў персанаж «Паўлінкі».

*(Агат—Агата)*


Анаграмы
Творацъ
Загадку
Літары
Ў розным
Парадку.

Ты чуў? —
Афганская сталіца
З пшанічным хлебам
Парадніцца
Змаглі ў далёкія гады:
Адны і тыя ж
Два склады
Гучаць у іх
Суладна, гладка,
Ды толькі
Не ў адным
Парадку.

*(Кабул—булка)*

Хочаш ты,
Каб элемент хімічны
Паралелаграмам
Стаў? —
Пачатковы зычны
У канец
Пастаў.

*(Бром—ромб)*

Насякомае,
Нам знаёмае,
Джаліць меціцца
Ў твар.
Змяшай
Літары —
Яно, хітрае,
Дасць за грошы
Тавар.

*(Камар—крама)*

Знаёмы тут
Выпадак:
Змяні ты
Літарны парадак —
І рыба з ходу,
Без замінкі
Паўстане
Месцам адпачынку.

*(Карп-парк)*

Ад раны след
На скуры —
Такі мой сэнс пануры.
А прачытай
Наадварот —
Пакліча музыка
Ў паход.

*(Шрам—марш)*

Кожны ведае
Пра гэта,
Што дзівосаў
Шмат на свеце.
Нат вядомая планета
Можа тарай
Стаць для смецця:
Перад словам
Не пасуй —
Літары
Ператасуй

*(Уран—урна)*

**Снарад спартыўны.**
**Змяні ты**
**Слова вязь —**
**І, як ні дзіўна:**
**Вялікі рускі князь.**

*(Гіра—Ігар)*



Каб частка судна
Ды імем стала,
Не будзь марудны —
Работы мала:
Ану,
Мой дружа малады,
Вазьмі і перастаў
Склады!
*(Карма—Макар)*

Без ніякай бяды
Перастаў ты
Склады —
Цыліндрычны сасуд
Ажыве
Тут як тут.
*(Банка—кабан)*

Слова
Спераду чытаеш —
Ім
Паветра
Ты ўдыхаеш.
А чытаеш
Слова
Ззаду —
Адпачыць
Заўсёды рады.
*(Нос—сон)*



Крапівы
Герой вясёлы
Стане
Коласа героем,
Калі слова
І не ўсё мы
Асцярожна
Перакроім.
*(Батура—Барута)*

Літарам у слове
Пры адной будове
Даць
Другую трэба —
І суквецце злакаў
Гордым,
Смелым птахам
Панясецца
Ў неба.
*(Колас—сокал)*

Мне заўсёды
Служыць табе
Люба:
Мною раніцай
Чысціш ты зубы.
Першы зычны
Ў канцы
ставіш слова —
Называю я
Зборнік Лынькова.
*(Паста—«Астап»)*



## ЗМЕСТ


ШАРАДЫ — 3

МЕТАГРАМЫ — 9

ЛАГАГРЫФЫ — 15

АНАГРАМЫ — 21



Издание для детей и юношества

**КУРБЕКО Иван Степанович**

**ХИТРЫЕ БУКВЫ**

**Шарады, метаграммы, логогрифы, анаграммы**

Для младшего школьного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Выданне для дзяцей і юнацтва

**КУРБЕКА Іван Сцяпанавіч**

**ХІТРЫЯ ЛІТАРЫ**

**Шарады, метаграмы, лагагрыфы, анаграмы**

Мастацкі рэдактар *Ю. Ц. Цярэшчанка*

Тэхнічны рэдактар *Н. П. Дасаева*

Карэктар *А. К. Юшына*

30 к.




ІБ № 1572

Здадзена ў набор 02.08.90. Падпісана да друку 17.01.91. Фармат $70 \times 100^{1}/_{16}$. Папера афс. № 1. Гарнітура Тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 1,95. Ум. фарб.-адб. 11,70. Ул.-выд. арк. 2,00. Тыраж 80 000 экз. Зак. 609. Цана 30 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага Камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінская фабрыка каляровага друку. 220115, Мінск, Каржанеўскага, 20.

Дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны Мінскім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінатам МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.